# Дзень народзінаў

*Словы* Святланы Куль-Сяльвестравай
*Музыка* Алега Капянкова




Дзень народзінаў. З гэтай нагоды
Я цябе аб адным папрашу -
Падары мне сябе назаўсёды,
Назаўжды - і руку, і душу.

Маю права ў дзень гэты светлы
На здзяйсненне жаданняў і сноў,
І таму у каханай кабеты
Я прашу назаўсёды любоў.

Да каменя на свежай магіле,
Да жалобнай апошняй труны,
І пасля, за зямным небасхілам.
Толькі мне - і каханне, і сны.